
Падтрымай "Вясну" на PATREON

У рэгіёнах асудзілі ўдзельнікаў маршу недармаедаў дапоўнена

16.03.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Суды ў Магілёве: Ігар Чарак.

Сёння ў судах Гародні і Магілёва адбыліся разгляды адміністрацыйных спраў, заведзеных на ўдзельнікаў акцый пратэсту, якія адбыліся 15 сакавіка. Па падліках праваабаронцаў, у абласных цэнтрах супрацоўнікі міліцыі затрымалі ўчора больш за 15 чалавек.

Гародня

Стала вядома, што на дваіх удзельнікаў акцыі 15 сакавіка, якія былі ў масках, склалі пратаколы правапарушэння. Гэта **Раман Кац** і **Андрэй Кніга**. Калі будзе суд - невядома. Яшчэ аднаго, непаўнагадовага, адпусцілі з РАУСа Ленінскага раёна ноччу. Праваабаронцы высвятляюць лёс астатніх

затрыманых, але у РАУСе інфармацыі не даюць і накіроўваюць у прэс-службу абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў. Старшыня Ленінскага суду Гародні адмовілася сустрэцца з праваабаронцамі, якія хацелі спраўдзіць інфармацыю пра суды, спаслаўшыся на непрыёмны дзень.

У суд Ленінскага раёна вязуць актывіста АГП **Аляксандра Лаўрэнцьева.**



Каля 12.30 стала вядома, што Аляксандр Лаўрэнцьеў знаходзіўся ў гарадзенскім ізалятары часовага ўтрымання. Яго павінны прывезці ў суд Ленінскага раёну для разгляду адміністрацыйнай справы. Але нібыта спярша павезлі ў РАУС. Тым часам праваабаронцаў папрасілі пакінуць будынак суда, спаслаўшыся на абедзенны час.

Суддзя **Дзмітрый Бубенчык** пачаў працэс у 15 гадзін, не прадставіўшыся. Лаўрэнцьеў адмовіўся ад дачы паказанняў, бо не бачыць у гэтым сэнсу. Суддзя не можа разабраць, што напісана ў пратаколе правапарушэння. Праглядзеў відэа з месца падзей. Выступілі сведкі - маёр Андрэй Пігулскі, наступны сведка старэйшы лейтэнант Кашкевіч. Пасля перапынку суддзя абвясціў - 13 сутак арышту.

Магілёў

Пакуль вядома, што у судзе Ленінскага раёна на 10 гадзін раніцы прызначаны разгляд адміністрацыйных спраў **Аляксандра Царука** і **Аляксандра Нажэнкі**. На іх былі складзеныя пратаколы за непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі (арт 23.4 КаАП). Пакуль яны ў ізалятары часовага ўтрымання. Праваабаронцы паведамляюць, што сярод затрыманых учора – Аляксандра Страха няма.

Затрыманую ўчора маці чатырох непаўнагадовых дзяцей **Алену Крэнь**, сёння выклікалі на 9 раніцы, далі позву у РАУС на 12.30 і склалі пратакол правапарушэння па арт. 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве).


У Ленінскім судзе Магілёва з'явіўся спіс разглядаемых адміністрацыйных спраў, у якім фігуруюць затрыманыя ўчора ўдзельнікі акцыі. У спісе 8 асобаў. Суддзя В. Палякова ў 14-00 пачне разгляд справы **Ігара Чарака** (раней падаваўся як Чарняк), а ў 14-30 – **Аляксандра Нажэнкі.**

Аляксандр Нажэнка (пенсіянер, ліквідатар аварыі на ЧАЭС) папрасіў суддзю даць яму суткі, таму што ён збірае грошы на аперацыю па зроку і баіцца, што калі яму дадуць штраф, ён застанецца сляпым. Падпісаў паперу аб прызнанні віны і згодзе на скарочаны парадак суда. Суддзя Палякова вынесла пастанову аб адміністрацыйным папярэджанні. Гэта самае мякчэйшае пакаранне.



Ігара Чарака вінавацяць у непадпарадкаванні і ўдзеле ў несанкцыянаваным мітынгу. Чарак часткова прызнаў віну па абодвух артыкулах.

Сведка - Юдзін Аляксандр Сяргеевіч, камандзір каманды АМАП УУС Магаблвыканкама. Сведка заявіў, што калі яны падышлі да Чарака, то ветліва прадставіліся і паказалі пасведчанні. Калі Чарака пачалі хапаць, Юдзін, нібыта, узяў пасведчанне ў зубы і ўсе навакольныя маглі бачыць гэта пасведчанне. Яшчэ адзін сведка - Ярмолін Сяргей Сяргеевіч. Суддзя Палякова вырашыла паглядзець відэа з Чараком, а затым выслухала сведку – інспектара РАУСа Дзяніса Ваньковіча. Пастанова - арышт на 15 сутак.



Суддзя Т. Касцюк разглядае справу **Алены Крэнь**. Пачатак у 14-00. Прысуд - штраф 10 базавых велічынь.

Справа **Аляксандра Царука** на разглядзе ў суддзі Вольгі Бекушавай, пастанова - штраф 25 базавых велічынь.

Алега Мяцеліцу суддзя С. Мазурава пакарала арыштам на 12 сутак.

Таксама ў другой палове дня пройдуць суды над **Зміцерам Люнтавым, Канстанцінам Чарновым і Аленай Кісель.**

У Чарнова пераломы абедзьвух рук, якія ён атрымаў да акцыі. Яму прысудзілі штраф у памеры 20 базавых велічынь. Суддзя - Т. Рубіс.

Алену Кісель суддзя Ратнікава пакарала штрафам у памеры 15 базавых велічынь па ч.1 арт. 23.34 КаАП.


Справу Зміцера Люнтава разглядала суддзя Літвіна, якая вынесла пастанову аб арышце на 15 сутак.


Орша.

16 сакавіка ў судзе Аршанскага раёна вынесеная пастанова ў дачыненні да старшыні адршанскага аддзялення прафсаюзу РЭП **Аляксандра Булаўкі**. За удзел у акцыі пртэсту 12 сакавіка яго пакаралі арыштам на 12 сутак.


Твитнуть







ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Мы не хочам быць заложнікамі" – акцыя вясноўцаў у Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Заява аб прызнанні палітвязнямі Аляксея Камароўскага, Іллі Шакірава і Барыса Протасава

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO


HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY